Міткевіч В.С., студ. гр. 311 “А”  БДУКМ

# ПРАБЛЕМА СУАДНОСІН ЛОГІКІ І ІНТУІЦЫІ У КАНТЭКСЦЕ МЕНЕДЖАРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Праблема суадносін логікі і інтуіцыі мае істотнае значэнне для менеджарскай дзейнасці ўвогуле і ў сферы культуры. Разам з тым гэта цікавая і спрэчная тэарэтычная праблема. Колькі дыскусій выклікала дадзеная праблема ў кантэксце навуковых адкрыццяў. Карл Попер лічыў, што ніякай логікі, ніякага алгарытму адкрыцця ў прынцыпе быць не можа. Магчыма тут спрацоўваюць інтуітыўныя механізмы кшталту “творчай інтуіцыі”, фаварызаванай Анры Бергсонам [2, с.6-7]. В. С. Сцёпін прытрымліваецца супрацьлеглай думкі, ён лічыць логіку адкрыцця магчымай і неабходнай [1,с.9]. Па вялікім рахунку менеджарскае рашэнне шмат у чым падобнае да навуковага адкрыцця. Дадзеная праца і прысвячаецца праблеме суадносін логікі і інтуіцыі ў кантэксце прыняцця  рашэнняў.

У рамках класічнай філасофіі інтуіцыя - гэта прамое, непасрэднае меркаванне праўды, у адрозненне ад апасродкаванага, разумовага спазнання. Інтуіцыя - вышэйшы шлях інтэлектуальнага спазнання, падчас якога чалавек адначасова думае і сузірае.  На пачатку 20 стагоддзя інтуіцыя вызначаецца як спецыфічнае ўменне чалавека бачыць цэлае раней яго частак. Пры гэтым логіка і інтуіцыя, як правіла, супрацьпастаўляліся. І гэта адносна правільна: логіка інтуіцыю замяніць не можа ў прынцыпе: гэта вынікае з тэарэмы Гёдэля пра поўнасць. Калі выказвалася думка, што ім быў разбураны падмурак матэматыкі, ён адказваў на гэта, што, па сутнасці, асновы засталіся такімі ж непарушнымі, як і раней, а яго тэарэма проста прывяла да пераацэнкі ролі інтуіцыі і асабістай ініцыятывы ў адной з галін навукі, у той, у якой кіруюць жалезныя законы логікі, якія пакідаюць, здавалася б, мала месца для згаданых якасцяў. Пра гэта сведчыць і тэорыя прыняцця рашэнняў. Гэта нават не тэорыя, а практыка: напачатку мінулага стагоддзя на працягу больш 20 гадоў даследаваліся перадумовы поспеху 500 найбагатых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

амерыканцаў, якія пачыналі з нуля. Вось што сярод іншага выявілася: гісторыі вялікіх багаццяў маюць шмат агульнага: так, усе іх уладальнікі прымаюць рашэнні на лёце, але вельмі павольна і асцярожна іх змяняюць. А ўсе без выключэння няўдачнікі падобныя адзін на аднаго ў процілеглым: яны вельмі павольна прымаюць рашэнні, затое змяняюць іх хутка і часта.

Існуюць тры спосабы прыняцця рашэнняў: па – першае, лагічна - шляхам лагічнага аналізу сітуацыі, на аснове даследавання ўсіх дадзеных і тэхнічных дэталяў істотных у дадзеным выпадку; па – другое, на аснове "разумнага сэнсу" – у згодзе з тым, як у дадзенай сітуацыі дзейнічаюць іншыя, пры неабходнасці раячыся з імі; па – трэццяе, інтуітыўна - калі ёсць уражанне, што рашэнне дакладнае, то яно і прымаецца без наступнага лагічнага аналізу. Калі рашэнні прымаюццца на аснове логікі, дык маюць месца істотныя небяспекі. Шмат хто думае, што дзейнічае вылучна на аснове логікі, але гэта не так, варта закрасціся толькі адной памылцы ў зыходных пасылках, аднаму няслушнаму параметру, як усе высновы будуць няслушнымі. Сумніўна, што важныя рашэнні прымаюцца шляхам лагічнага аналізу. Ці не служыць логіка для падагнання прынятага рашэння пад ужо вядомы адказ? Тыя, хто спадзяецца на логіку, насамрэч, хутчэй за ўсё, дзейнічаюць на аснове "разумнага сэнсу". Гэта такія дзеянні і ўчынкі, якія будуць ацэньвацца асяроддзем дадзенага чалавека як звычайныя. "Разумны сэнс" - гэта, насамрэч - калектыўны розум, асераднёны розум натоўпу. Калі мы жадаем атрымаць вынік, які вылучаецца з іншых, то мы павінны дзейнічаць не так, як дзейнічаюць іншыя, і не так, як іншыя раяць. Усе, хто дамагліся незвычайных поспехаў у жыцці, дзейнічалі менавіта насуперак меркаванню астатніх. Фарадэй, старанна хаваў, што ён думае і як разумее свет, гэта дазволіла яму ў нейкай ступені выглядаць "як усе". Ван-Гог, у якога камора была забіта яго карцінамі на сотні мільёнаў даляраў, жыў надгаладзь, таму што не мог дамовіцца з "разумным сэнсам" і пісаць карціны "як належыць". Творчым людзям, хто думае не так, як натоўп, бывае матэрыяльна цяжка. Зусім іншая справа там, дзе ўсё правяраецца рублём, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бізнэсе: тыя, хто думае насуперак "разумнаму сэнсу", хто прымае самастойныя рашэнні, дасягае поспеху і дабрабыту.

Інтуіцыі бывае дастаткова для праўдзівага меркавання, але яе не хапае, каб пераканаць у гэтай праўдзе іншых і самога сябе. Правільнасць прасвятлення старажытных грэкаў, што свет складаецца з атамаў, атрымала пацверджанні праз тысячагоддзі. Майкл Фарадэй сваё прасвятленне зафіксаваў у лісце нашчадкам, і толькі праз дзесяцігоддзі Джэймс Максвел прывёў матэматычныя доказы правільнасці інтуітыўнага прасвятлення "непісьменнага вучня пераплётчыка". Але доказы Максвела выявіліся як недастатковыя і спрэчкі пра тое, ці меў рацыю Фарадэй ідуць дагэтуль. Нельга знайсці чалавека, які б на сабе не выпрабаваў сілу інтуіцыі. Гэта - імгненнае прасвятленне, якое нам прапануе адназначныя рашэнні. Людзі, якія актыўна валодаюць інтуіцыяй, вырашаюць новыя складаныя праблемы, прапускаючы іх праз сваё ўнутранае бачанне рэальнасці. Мы валодаем двума спосабамі ўспрымання рэальнасці - інтуітыўным і лагічным. Даволі часта гэтыя два спосабы канфрантуюць паміж сабой. Логіка адпрэчвае інтуіцыю, інтуіцыя стрымлівае логіку. Для таго, каб логіка з інтуіцыяй не канфрантавалі, ім трэба вылучыць поле дзейнасці, на якім яны будуць супрацоўнічаць. Сэнс інтуіцыі - у тым, каб абагульняць інфармацыю, якая збіраецца намі ўсімі магчымымі спосабамі. У сувязі з гэтым інтуіцыя - стратэг, логіка - тактык. Інтуіцыя задае генеральную лінію, - логіка вырашае, як гэта рабіць і калі. Лагічнае мысленне, з пункту гледжання працэсу энерга-інфармацыйнага абмену ўяўляе сабою падвойную мадэль пошуку магчымасцяў. Але інтуіцыя - гэта не спосаб думаць, гэта спосаб пошуку аптымальнага выніку. Інтуіцыя ўяўляе сабой наймагутнейшую прыладу, якой можна і трэба карыстацца. Свядома аб'яднаўшы гэтыя дзве эфектыўныя прылады, можна дасягнуць новых, больш высокіх мэтаў у жыцці і ў самарэалізацыі.

На першым месцы пры прыняцці рашэнняў стаіць інтуіцыя, але без логікі ніводнае рашэнне не можа прыняць развітую артыкуляваную форму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інтуіцыя і логіка цесна звязаны паміж сабой ў любой сферы дзейнасці. І нягледзячы на ўсе спрэчкі і дыскуссіі навукоўцаў, можна зрабіць выснову, што інтуіцiя і логіка ўвогуле не могуць узнікнуць адна без адной. Калі мы прымаем інтуітыўнае рашэнне, а як мы ўжо падкрэслілі яно з'яўляецца імгенным прасвятленнем, то яно хутка зменіцца, бо прыме іншую, апасродкаваную, лагічную форму.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Степин В.С. Становление научной теории: Содержательные аспекты строения и генезиса теоретических знаний физики / В.С.Степин. – Минск: Издательство БГУ, 1976. – 319с.
2. Popper, K.R. Logik der Forsehung / K.R.Popper. – 10.Aufe. – Tubingen: J.C.B. Mohr (Paul Subeck), 1994. – 481S.

[Электронны доступ]: http://www.bibliotekar.ru/iiIntuic.htm Дата доступу: 14.02.2012


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ